# ДЗЕЙНАСЦЬ ВЕЛІКАКНЯЖАЦКАЙ КАНЦЫЛЯРЫІ ВКЛ У СФЕРЫ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ДЗЯРЖАВЫ Ў КАНЦЫ XV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

**МІКАЛАЕВА Л.В.**
КАНДЫДАТ ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК, ДАЦЭНТ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІНФАРМАТЫКІ І РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ
Г. МІНСК, БЕЛАРУСЬ

На дзяржаўную канцылярыю была ўскладзена падрыхтоўка ўсіх дакументаў, ствараўшыхся ў цэнтральным апараце кіравання ВКЛ, а таксама праца з дакументамі, паступаўшымі з іншых месцаў. У сілу гэтага адной з важнейшых функцый канцылярыі стала забеспячэнне практычнай дзейнасці дыпламатычнай службы ВКЛ неабходнымі архіўнымі звесткамі і дакументамі. Да таго ж з кола яе супрацоўнікаў рэкрутаваліся дыпламатычныя агенты [2, с. 17]. Акрамя таго канцылярыя ажыццяўляла дакументальнае афармленне распараджэнняў гаспадара, паноў Рады і ўхвал соймаў, што датычылі мабілізацыйных і ваенных мерапрыемстваў, мераў фінансавага забеспячэння ўсіх сфераў знешняй палітыкі. Яна ж забяспечвала дастаўку гэтых распараджэнняў на месцы, фактычна выконваючы функцыі дзяржаўнай пошты.

Спецыфічнай рысай канцылярыі ВКЛ быў яе свецкі характар. Толькі лацінскія сакратары і пісары, часта па паходжанню палякі, маглі займаць адначасова касцёльныя пасады [9, с. 30].

Як адна з нямногіх цэнтральных устаноў дзяржавы, канцылярыя ВКЛ мела і свой штат служачых. Аснову яго складалі канцлер, найвышэйшы і старэйшы пісары, сакратары, пісары і дзякі.

На чале канцылярыі стаяў канцлер, які з 1458 г. звычайна з’яўляўся і віленскім ваяводам. У сілу займаемых пасад канцлер у абавязковым парадку ўваходзіў у склад “Преднейшей” Рады, дзякуючы чаму меў магчымасць прымаць непасрэдны ўдзел у фарміраванні знешнепалітычнага курса дзяржавы. Захавальнікам вялікай маястатнай пячаткі, без скраплення якой ні адзін афіцыйны дакумент не меў юрыдычнай моцы, быў таксама ён. Канцлер меў права на адмову ў зацвярджэнні пячаткай дакументаў, падпісаных гаспадаром, у тым ліку і тых, што выходзілі па-за межы дзяржавы, калі яны супярэчылі заканадаўству. Апошняя акалічнасць стварала сітуацыю, калі ад яго пазіцыі залежала прыняцце таго ці іншага рашэння па пытаннях міжнароднага характару [4, с. 27]. У абавязкі канцлера ўваходзіла і праверка правільнасці афармлення пасольскай дакументацыі [6, арк. 182 адв.].

Намеснікам канцлера быў найвышэйшы пісар, да якога перайшло рэальнае кіраўніцтва ўстановай пасля таго, як канцлер, будучы членам “Преднейшей” Рады, усё больш прыцягваўся да вырашэння агульнадзяржаўных спраў і фактычна адыходзіў ад рэальнага кіраўніцтва канцылярыяй. У час адсутнасці найвышэйшага пісара (сакратара) функцыі

Библиотека БГУИР

апошняга па нагляду за выкананнем метрычных копій і тэкстаў дакументаў выконваў пісар старэйшы. Звычайна гэтыя асобы адказвалі за падрыхтоўку дыпламатычнай дакументацыі і вядзенне пасольскіх кніг, якое пачалося з 1486 г. [3, с. 24, 28].

Асноўныя выканаўчыя функцыі былі ўскладзены на пісараў, сакратароў, колькасць якіх спачатку не была рэгламентавана, а пасля рэарганізацыі ў 10–20 х гг. XVI ст. склала 2–3 пісары (сакратары) на кожны моўны аддзел, і дзякаў [3, с. 33, 37]. У абавязак пісараў і сакратароў уваходзіла складанне і канчатковае рэдагаванне тэкстаў дакументаў. Яны рабілі гэту справу па загаду канцлера або гаспадара, а таксама нярэдка на падставе таго, што самі чулі пад час пасяджэння Рады. Да 1522 г. яна часам магла выконвацца і распараджэнні якога-небудзь іншага саноўніка. З 1522 г. пры ўступленні на пасаду пісары пачалі даваць прысягу, па якой абавязаліся не выдаваць з канцылярыі лісты без загаду канцлера ці гаспадара і не разглашаць давераныя ім тайны [1, с. 177]. Чыста тэхнічныя функцыі ў гаспадарскай канцылярыі былі ўскладзены на дзякаў. У іх абавязак уваходзіла перапісванне тэкстаў дакументаў, што папярэдне былі адрэдагаваны пісарам і праверааны канцлерам, і наступнае іх ўнясенне у метрычныя кнігі [5, с. 390–391; 4, с. 27].

Даследчыкі слушна адзначаюць шматмоўнасць канцылярыі, адкуль выходзілі афіцыйныя дакументы на “рускай”, лацінскай, татарскай, польскай, нямецкай, італьянскай, неафіцыйныя – на яўрэйскай мовах [2, с. 18]. Аднак да 40-х гг. XVI ст. канцылярыя характарызуецца функцыянаваннем у ёй двух моўных аддзелаў: “рускага” (“рускай канцылярыі”) і лацінскага (“лацінскай канцылярыі”), якія пазней былі ліквідаваны [3, с. 25, 39]. Акрамя “рускіх” і лацінскіх пісараў (сакратароў) крыніцы ведаюць яшчэ татарскіх і арабскіх пісараў, назва якіх адлюстроўвае накірунак іх дзейнасці: удзел у дыпламатычных зносінах з краінамі Усходу. Па паходжанні гэта звычайна былі татары, аселыя ў ВКЛ. Яны ж выкарыстоўваліся канцылярыяй ВКЛ і ў якасці перакладчыкаў (талмачоў). Аднак талмачы не былі ў гэты час сталымі служачымі канцылярыі. Да іх паслуг звярталіся толькі ў час патрэбы. Татарскімі талмачамі служылі і армяне [7, арк. 22 адв.].

Нягледзячы на тое, што афіцыйным месцам размяшчэння канцылярыі была Вільня, яе справаводчая дзейнасць ажыццяўлялася ў розных месцах ВКЛ і ў Польшчы. Падчас пераездаў вялікага князя па краіне яго суправаджаў штат канцылярскіх работнікаў, якія дакументавалі прымаемыя рашэнні ў месцах прыпынкаў і нават “в обозе”. Часам з месцаў такіх прыпынкаў за мяжу адпраўляліся пасольствы. Існуе меркаванне, што пры ад’ездах гаспадара ў Польшчу канцылярыя распадалася на дзве часткі. Першая з іх рухалася за вялікім князем і ўключала, на думку Т.А. Тапалавай, самых заслужаных пісараў, дыпламатаў, радных паноў (прыкладна трэцяя частка ўсіх супрацоўнікаў). Яны выступалі даверанымі асобамі вялікага князя па падтрымцы сувязяў з ВКЛ. Другая частка канцылярыі, як правіла, на чале з канцлерам, працягвала функцыянаваць у Вільні. Яна забяспечвала

Бібліятэка БГУІР

дзейнасць застаўшыхся ў ВКЛ радных паноў па аператыўнаму цякучаму кіраванню краінай [9, с. 30–31].

Як высветліў Э.Д. Банёніс, ужо з канца XV ст. у дзяржаўнай канцылярыі праявілася спецыялізацыя пісараў. Ён вызначыў кола пісараў, займаўшыхся вядзеннем пасольскіх кніг і падрыхтоўкай дыпламатычных дакументаў (хаця ў той час пасада пісара пасольскага ўведзена не была). Пры гэтым трэба звярнуць увагу на тое, што ўсе пісары з гэтага кола: Ф. Рыгоравіч, І.С. Сапега, М. Богуш Багавіцінавіч, І. Гарнастай, М.В. Свінюскі [2, с. 19], – займалі пасады найвышэйшых і старэйшых пісараў, якім належала рэальнае караўніцтва канцылярыяй [3, с. 14–17, 24, 28, 38]. У сілу гэтага, а таксама заняцця іншых пасад яны мелі доступ у Раду, а тым самым магчымасць уплыву на знешнюю палітыку дзяржавы. Як падаецца, гэта супадзенне не выпадковае. На наш погляд, ўключэнне ў іх кампетэнцыю вядзення дыпламатычнай дакументацыі было звязана менавіта з уваходжаннем гэтых персон у склад Рады і абумоўлена імкненнем членаў Рады не дапусціць пабочных асоб да валодання дзяржаўнай тайнай. З гэтым жа, з аднаго боку, было звязана і прызначэнне названых асоб у склад пасольстваў, накіроўваемых за мяжу. Дадзенае меркаванне можа мець пацверджанне ў тым факце, што ў канцы XV – першай чвэрці XVI ст. гэтыя пісары самі асабіста займаліся тэхнічным выкананнем дакументацыі пасольстваў і пад час спаўнення дыпламатычных місій у замежных краінах [8, с. 142, 398, 635, 729]. З другога боку, прызначэнне азначаных асоб было звязана з іх прафесійнымі абавязкамі, назапашаным вопытам і знаёмствам з рэаліямі тых краін, куды іх накіроўвалі ў якасці паслоў. Але з першай чвэрці XVI ст. гэта абумоўлівалася яшчэ і заняццем іншых пасад, зноў-такі даваўшых доступ у Раду. Апошняя акалічнасць выклікала адцяг ўвагі найвышэйшых пісараў, якія з 20-х гг. XVI ст. былі звычайна і падскарбімі земскімі [3, с. 38], да іншых дзяржаўных спраў. Рэальнымі тэхнічнымі выканаўцамі сталі дзякі, на якіх ускладалася вядзенне пасольскіх кніг. Такім чынам, арганізацыйныя рысы пасольскай службы, якімі Э.Д. Банёніс лічыў спецыялізацыю пісараў на вядзенні пасольскіх кніг і падрыхтоўцы дыпламатычнай дакументацыі, фармаванне прынцыпаў падбора паслоў, іх спецыялізацыю ў дыпламатычных зносінах ВКЛ з пэўнымі дзяржавамі [2, с. 20], – на наш погляд, праявіліся толькі ў тым субардынацыйна-іерархічным пласце канцылярыі, які быў цесна звязаны з гаспадаром і Радай паноў. Таму, як падаецца, нельга адназначна сцвярджаць, што яны праявіліся толькі на ніжэйшым тэхнічным узроўні канцылярыі. Можна выказаць меркаванне, што такі працэс ішоў і на ўзроўні кіраўніцтва знешняй палітыкай, у прыватнасці, у асяроддзі Рады паноў. Аднак, як слушна зазначыў Э.Д. Банёніс, Рада працівілася канцэнтрацыі кіраўніцтва ў руках якога-небудзь аднаго яе члена [2, с. 11] (звычайна – канцлера). Таму вынікам азначаных працэсаў стала толькі праяўленне зародкавых элементаў структуры знешнепалітычнага ведамства. Прычым у сферу кампетэнцыі яго ўваходзілі не толькі дыпламатычныя кантакты і іх дакументацыйнае забеспячэнне, але і мерапрыемствы ў галіне знешнепалітычнай прапаганды і ваеннай палітыкі,

Библиотека БГУИР

паколькі яно кардынавала дзеянні, накіраваныя на падрыхтоўку і выкарыстанне (праднамеранае ці вымушанае) вайсковых сіл для дасягнення тых ці іншых знешнепалітычных мэтаў. Аднак канчатковага аб'яднання распарадчых і выканаўчых функцый і выкрышталізавання яго ў якасці дзяржаўнай установы па кіраванню знешняй палітыкай так і не адбылося.

Усё гэта дае падставу зрабіць выснову, што канцылярыя ў ажыццяўленні знешняй палітыкі выконвала справаводча-выканаўчую і палітычную функцыі. З аднаго боку, канцылярыя была тэхнічным органам у вядзенні справаводства і выкананні даручэнняў вялікага князя, Рады і сойма. З другога, яна паступова ператваралася ў цэнтр палітычнай думкі, дзякуючы якаснаму складу сваіх супрацоўнікаў. Служачыя канцылярыі сумяшчалі канцылярскія абавязкі з іншымі важнымі пасадамі, даваўшымі доступ у Раду. Тым самым яны атрымлівалі магчымасць актыўна ўплываць на знешнюю палітыку дзяржавы.

Літаратура

1. Акты Литовско-Русского государства. Изд. М. Довнар-Запольским. – М.: Университетская типография, 1899. – Вып. I: 1390–1529. – 258 с.

2. Банёнис, Э.Д. Посольская служба Великого Княжества Литовского (середина XV в. –1569 г.): Автореф. дис…канд. историч. наук: 00.07.02/ Э.Д. Банёнис, Ин-т истории АН Литвы. – Вильнюс, 1982. – 21 с.

3. Груша, А. Службовы склад і структура канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага 40-х гадоў XV – паршай паловы XVI ст./ А. Груша// METRICIANA: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. – Мінск: Atheneum, 2001. – Т. 1. – С. 11–45.

4. Кананові, У.І. Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст. (Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам): Дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02/ У.І. Кананові. – Мн., 1997. – 95 с.

5. Любавский, М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства/ М.К. Любавский. – М.: Изд-во Имп. О-ва Ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232 с.

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 15.

7. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 524.

8. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 1: 1487–1533/ Под ред. Г.Ф. Карпова// Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип-я Ф. Елеонского, 1882. – Т. 35. – VI, 869, XII с.

9. Топалова, Т.А. Задачи изучения канцелярии ВКЛ на материалах Литовской метрики/ Т.А. Топалова// Литовская Метрика: Тезисы докл.

Библиотека БГУИР

межресп. науч. конф., апрель 1988 г. – Вильнюс: Ин-т истории АН ЛитССР, 1988. – С. 28–31.

Библиотека БГУИР